# ГІДРОНІМЫ БРЭСЦКАГА РЭГІЁНА

Т. Л. ТАБАЛЕВІЧ, А. В. ШЧЭРБА

*УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», Брэст, Беларусь*
*13totale@mail.ru*

**Уводзіны.** У рабоце даследуюцца ўласныя назвы вадаёмаў Брэсцкага рэгіёна.

Актуальнасць даследвання тлумачыцца тым, што у наш час разбураецца традыцыйная беларуская вёска і разам з ёю знікае багаты пласт мікратапанімічнай лексікі, які назапашваўся на працягу стагоддзяў.

Мэта дадзенага даследвання – вызначыць гісторыю і асаблівасці паходжання гідронімаў Брэсцкага рэгіёна.

Мэта даследвання дасягаецца праз вырашэнне наступных задач:

- тапанімічная збіральніцкая дзейнасць студэнтаў праз вывучэнне гісторыі, этнаграфіі, геаграфіі краю, знаёмства з архіўнымі дакументамі;
- знаемства з тэарэтычнай базай праз навуковыя выданні вядомых беларускіх тапаністаў, напрыклад, В. Жучкевіча, І. Янкіна, А. Рогалева і г.д.;
- апытванне мясцовых жыхароў;
- занатаванне гістарычна-этымалагічных звестак на картцы.

Аб’ектам даследавання з’яўляюцца уласныя назвы вадаёмаў Брэсцкага рэгіёна.

**Матэрыялы і метады.** У даследаванні выкарыстаны аналітычны, храналагічны, параўнальны, картаграфічны метады.

Сістэматызаваны звесткі аб назвах рэк, рачулак, ручаёў, азёраў, што знаходзяцца на даследаванай тэрыторыі. Выяўлены звесткі аб месцы, адкуль яны бяруць пачатак і куды ўпадаюць; пры неабходнасці і магчымасці ўдакладнена даўжыня, шырыня і глыбіня, характар берагоў, дна і рэчышча.

**Вынікі і абмеркаванне.** Высветлены лінгвістычныя, пазалінгвістычныя, этналінгвістычныя выток і назваў вадаёмаў Брэсцкага рэгіёна. Многія гідронімы адлюстроўваюць велічыню і форму азёраў, а таксама іх колер і глыбіню (возера Белае, Чорнае). Некаторыя назвы гідронімаў звязаны з назвамі жывёл і раслін. Назвы некаторых азёраў і рэк гавораць пра характар берагоў.

Вывучэнне тапаніміі – адзін з асноўных кірункаў лінгвістычнага краязнаўства. Вынікі і палажэнні па тэме могуць быць выкарыстаны ў навучальным працэсе пры выкладанні дысцыпліны «Беларуская мова. Прафесійная лексіка» для студэнтаў першага курса ўсіх спецыяльнасцей. У прыватнасці, для студэнтаў факультэта інжынерных сістэм і экалогіі, якія вучацца па спецыяльнасці “Прыродаахоўчая дзейнасць”.

**Заключэнне.** Выяўлена, што часцей за ўсё ў тапаніміцы Брэсцкага рэгіёна ўжываюцца словы ўсходнеславянскага паходжання: Белае возера, Чорнае возера, Вісліца, Жабінка, Зяльвянка, Лясная, Ясельда, Мухавец, Мышанка, Няслуха, Піна, і г.д.